Ігар Сідарук

# САНАТА АРГАНАТА

KAMUNIKAT.org

Полацак
1994

# ТАНКІ БЯЗ ХОКУ

* * *
Вецер, вырві паэту язык!
Ён забыўся на песьні,
ад якіх засынаюць дзеці.

3.01.94

У парушэньне эстэтыкі

Дзеткі тоўпяцца ў ясьлях,
Усё ім вакол цікава:
Навошта тут столькі цацак?
Навошта столькі гаршчкоў?
А ў вочы ліецца песьня:
“Айчыннаму піву – слава!
Дзе піва, там лад і парадак!
Зьнішчым блакітную кроў!”

Дзеткі тоўпяцца ў школе,
Усё ім вакол цікава:
Навошта тут столькі крэйды?
Навошта столькі ануч?

Па горадзе ж бегае голы
І цырк рэклямуе на славу:
Усім прадае білеты
І скача ў вагонь, у вабруч.

Дзеткі тоўпяцца ў лазьні,
Усё ім вакол цікава:
Навошта тут тазікаў столькі?
Навошта столькі мачал?
А ў касе шыкоўная пасыя
Напарсткамі п”е какаву
І лічыць з дырэктарам “разікі”
І грошы, што той абяцаў…

Дзеткі тоўпяцца ў храме,
Усё ім вакол цікава:
Навошта тут столькі лядану?
Навошта столькі ікон?
І лёзунг на пляцы “Гэй, хамы!”
Лунае “Няхай нас мала,
Але абвясьцім Бадэн-Лядэну:
Ідзі, Бадэн-Лядэн, вон!”

Дзеткі тоўпяцца ў моргу,
Усё ім вакол цікава:
Навошта тут столькі трупаў?
Навошта столькі тугі?
А хтосьці плюецца: “Вой, горка!”
А хтосьці сьмяецца: “Ну, горка!”
А хтосьці шалее: “Цьфу, горка!”

І кідае ў морс прыправу,
Выводзіць кляйно пад пупам
І лупіць дзіцё: “Замест “боты”
Трэба казаць – “сапоги”!

1992

Мара заўтрашняга дня

Дрын у рукі. Шруб у лоб.
На адбой – Чайкоўскі.
І ніякіх вольных рыфмаў,
Бо за храп – па храпе!

Хто яшчэ тут не жывы?
Гэй садзіць хвасолю!
Гэтай песенькі куплет:
Фрэнчы – не для хворсу!

Шыхт у фронт! Руш у музэй!
Разглядаць Пікасу.
На апраўку – шэсьць сэкундаў,
Пяць – на харчаблёкі!

Квач у зубы. Рулю ў пах!
Гэта хвіззарадка.
Мара заўтрашняга дня:
Дзень палітзаняткаў!

І тры босых гэнэралы
Ў мілаваньні плачуць.
Ашчасьлінае людзтва
Гіп-мазурку скача!

20.01.03

* * *

расплявaліся самотныя паэты
за даносы плацяць ім мізэрна
лепш пяяць аб паньне ды “пра гэта”
лепей віны жлукціць па тавэрнах

ды на паннаў-віны трэба грошы
і таму хоць плацяць ім мізэрна
нібы верш удалы і харошы
керпаюць даносы па тавэрнах

і таму жывуць паэты нудна
і таму на сэрцы ў іх паскудна

1.02.94

* * *

У кавярні тры тапельцы
Елі музыку зь відэльцаў,
Адчувалі смак.
Па чарзе ахвіцыянты

Падавадi джаз i кантры,
З шэры-брэндзi гляк.

І аб”елiся тапельцы,
Пакiдалi ўсе вiдэльцы,
Iкаць пачалi.
Ў жыватах у iх вурчала…
Толькi музыка гучала.
Хоць i за рублi.

9.11.93

Дрэлi для народа

Ноччу прыйдзе морда.
Усядзецца ў хватэлi.
Скажа: “Для народу
Не хапае дрэляў!”

З мордаю згаджуся.
Ды здраньцьвею побач.
Зараву: “Маруся!
Як жа гэта, сволач,

Ты на белым сьвеце
Ад самай купелi
Да раскошы цела –
І жывеш бяз дрэлi?!”

І памрэ Маруся.
Кінецца па крамах.
Сярод цёмнай ночы
Будзе плакаць тама.

А я тую морду
Пацалую ў губы:
Каб ня тыя дрэлі,
То далі б мы дуба!

23.02.94

Сьмерць шалёным акупанцам!

Ах, якія ж у вас штукі!
Дайце іх вазьму я ў рукі –
Важаць: о-го-го!
А калі зубамі ўпіцца –
Не спатрэбіцца і піца –
То нэктар багоў!

Ах, якія ж у вас транты!
Сьмерць суседзкім акупантам
Ад такіх гафрэ.
Вось адзін спаўзае ракам,
Вось другі капытам бракнуў,
Але, гад, жарэ!

Ах, якія ж у вас клубы!..

(Каб яму стаяла дубам!)
Дайце ў рукі вэшч!
А яны няхай цікаюць!
Нашу мову зьневажаюць!
Увап"юсь, як клешч!..

Ах, якія ж у вас вочы!
Да такіх кабет ахвочы
І, ух, ласы я!
Будзем разам мы бадзяцца
І, страляючы, сьмяяцца:
Гэй, расейскія паяцы,
Чакае вас Амудар"я!
А можа, Сырдар"я...

03.01.94

А хто там ня йдзе?
  (Не-Купала)

А хто там ідзе, а хто там ідзе?
У вагромністай такой грамадзе?

- Курды, кітайцы, малайцы,
вузбэкі, таджыкі, нанайцы,
прамцузы, мадзяры ды грэкі,
гішпанцы, жамойты, ацтэкі,
хвіны, цыганы, аўкштоты,
японцы, мардва, гугэноты,
бразыльцы, расейцы, ангельцы –

нашыя ўсе аднасельцы!

А што яны нясуць на худых плячах,
На ў лапцях нагах, на ў крыві руках?

- Клункі, лядункі, карункі,
бразготкі, каралі, дарункі,
лыжкі, відэльцы, пярынкі,
ляўры, літаўры, катрынкі,
маркі, ены, даляры,
сэйфы, кансэрвы, раялі,
сьвістулькі, табаку, манэты,
самбрэра, кабрыялеты –
і крыўда бярэ іх за гэта!

А каму нясуць гэту крыўду ўсю,
А каму нясуць на паказ сваю?

- На хвэстываль у Каны,
у Токіё, Рыгу, Мілано,
там, дзе дыктатар Батыста
падданых пад"еў усіх чыста
і ў кашу смаркаецца ладна
зь гікаўкаю загаднай!
Туды, дзе плююцца культурна
паны за куцьцёю хаўтурнай.

А хто гэта йіх не адзін мільйон,
Крыўду несьць наўчыў, разбудзіў йіх сон?

- Пошасьць, агіда, трасца,
нейкі сьмярдзюх у калясцы,
паненка ці бабця з касою,
Касмадзямьянская Зоя!
Дурка, ачмурка, аблуда,
Гадзкі татуся юда.
Чароўная блёкава Дама.
І Харэ, і Крышна, і Рама!

А чаго ж, чаго захацелася йім,
Пагарджаным век, йім сьляпым, глухім?

- йім сьляпым, глухім
йім сьляпым глухім
йім...
сьляпым...
глухім...

1993-1994

* * *
Нехта ў чорных бліскучых ботах
Чарнавую любіць работу:
Выдае на ўздыхі ён квоту
І дазвол на жыцьцё выдае.
Нехта ў чорных бліскучых ботах
Ціха выгукне: “Маць тваю,
рота!
Руш капаць мармуровыя доты!”

Нехта ў чорных бліскучых ботах
Аб”ектыўны загад аддае.

Нехта ў чорных бліскучых ботах
Любіць хрэнам намазваць шпроты
І, смакуючы, песьціць галоту:
“Ах, гаротнчікі ж вы мае!”
Нехта ў чорных бліскучых ботах,
За маркотных дужа маркотны,
Вас разьлічыць на кожны чацьверты.
Нехта ў чорных бліскучых ботах
Сярод пляцу сьлязу змахне.

Нехта ў чорных бліскучых ботах
Напіваецца дрэні да рвоты,
Ненавідзіць марскія курорты,
На рачныя – дык проста плюе.
Нехта ў чорых бліскучых ботах –
Не зялёным, ня сінім, ня жоўтым –
Заўтра чорнаю ваксаю ўпотай
Нехта ў чорных бліскучых ботах
Афарбуе боты твае!

Лістапад, 1992

* * *

а я лясну галавою аб калодку
надакучыла хадзіць мне кучаравым
лепш закон прыму антыдзяржаўны

каб штодня мянялі мне калодку

надакучыла хадзіць мне кучаравым
і з кабетамі патэнцыі зьдзіўляцца
і шукаць таемную ў тым сувязь:
адчаго хаджу я кучаравым?

лепш закон прыму антыдзяржаўны
ды паеду па замежжах розных плакаць
хай мяне там нэгры пашкадуюць
бо за іх закон антыдзяржаўны

каб штодня мянялі мне калодку
о! тады я дыў бы чоху-дыхту!
я зрабіўся б сучым прэзыдэнтам!
вынайшаў гатунак новы піва!

ды штодня калодку не мяняюць...

23.03.04

* * *

ноч  настае
дроў нестае
труна на стале

У мой драны хватэль зноў сядае Вагнорюс.
І зьядае маю аўсяную кашу.
Плакала Саша ўголас –

Бо сушка смактала Сашу.

Я ў яго папрашу крыху драхмаў і рупій.
Хоць даўно не смакую салёнае рыбы.
Безь цябе мы, Вагнорюс, у глыбокае дупе.
А таму данкэ шён, ачіу ды спасіба!

хочаш
зарэжуся ноччу
ікламі воўчымі

Добра быць безгаловым і лезьці пад танкі.
Добра песьні сьпяваць у шале дэбільным.
Добра быць расстраляным пасьля пагулянкі.
Назаўжды маё сэрца аддадзена Вільні!

Толькі сноўдае там беспрытульны Вагнорюс.
І бяз кашы аўсянае жудасна плача.
Я ж зрываю прапіты, пракураны голас,
Бо даўно праглынуў тэнісны мячык.

ночка мінаецца
труна адчыняецца
адрубаны
пальцы...

Восень, 1993

* * *

напусьцілі вожыкі туманаў
ды з Калюмбіі нагналі мэрсэдэсаў
толькі сонейка ўставала раным-рана
пачалі яны судовыя працэсы

у руках у вожыкаў улада
ды таемнвыя швайцарскія рахункі
а таму засуджаныя сядуць
а таму зьбіраюць ужо клункі

і кладуць у клункі Карла Маркса
каб змагацца потым эхвэктова
з вожыкамі ды вось толькі баксы
маўзэру дыктуюць сваё слова

і паедуць вожыкі ў туманы
на сваіх таётах-мэрсэдэсах
каб ня жыць як вожыкі пагана
не хадзіце на судовыя працэсы!

21.11.93

* * *

хвайна “Правду” чытаць ворган учорашніх хіпі.
хвайна нафту Кувэйту прадаваць за даляры.
хвайна здымацца ў ложку з Мадоннаю ў кліпе.
хвайна калі на магіле тваёй плача гітара.

толькі пагана калі ўсе за сіротак гарою.
толькі пагана калі крупнік блытаюць з чачай.
толькі пагана калі за табою зашморгваюць шторы.
і пагана ў бязвокім люстэрку да агіды шчасьлівага ўбачыць.

3.03.94

KAMUNIKAT.org

Восьмая форма паскудзтва

Па Менску скачуць пацукі,
За імі шнырацць вахлакі,
А скураныя хлопчыкі
Пьюць каньякі зь сіропчыкам.

Па ліхтарах страляе танк,
Квітнее рэкэцёрскі банк,
А белыя каўнэрыкі
Ядуць вачмі Амэрыку.

Па вечарах гудзіць гатэль:
Б”юць грудзі трапна, усе ў цэль.
У іх паперкі цьвёрдыя,
Таму й швайцары гордыя.

Па вуліцы ідзе паэт,
“Жанэт” рыфмуе ён з “клязэт”,
Рыфмуе ён “гармонію”
Зь “дзяржаўнай філярмоніяй”.

Насустрач – з ружамі яна…
Паэт зьбялее, бы сьцяна,
Ня ў сілах схамянуцца
Ад гэткага паскудзтва.

І рушыць зноў далей паэт,
І ўжо прыдумае: “Клязэт –
Ёсьць мадэрновы пісталет,

Дзе ўвесь сышоўся клінам сьвет,
Дзе той шчасьлівы, хто білет
Назад ніколі не бярэ...”
Пах руж няўлоўны на стале.

1992

## Пасьля...

вось і прыйшлі нараніцу – сукі
ходзяць ды пэцкаюць дзёгцем вароты
татуіроўку выводзяць чырвоным
каб за гарбатаю – стосам газэты

а ў тых газэтах партрэты вялікіх
і незаменных у шале даярак
з вымямі дойнымі як у гарбуза
што фаршаванымі згамі страляе

і ўжо ня трэба ні “ма” там ні “мама”
ні пасьмяротнай адчайнай цыдулкі
бо не чытаюць важнецкія сукі
нават інструкцый да брудных каструляў

так што браточкі адно застаецца
порткі садраць ды па горадзе – голым
голых здаецца яшчэ паважаюць
голым чапляюць мэдалік на дупу!

23.03.04

* * *

надвячорак –
напружанасьць
марнасьці

30.10 91

# АРГАНАЎТЫКА

## Шоў

Колькі каштуе білет?
Станчы стрыптыз,
каханая…

6.08.92-18.04.94

* * *

Ю. Гуменюку

Мае пах таямнічы сэксуальная ружа.
У бяздоньні грабніцы мэдытуе паўсфынкс.
З рыльца п”е Арпачай валацуга нядужы,
Які ехаў у Менск, а прычухаў у Мінск.

Цела пругкае прагне зьнясілець у шурфе.
П”янкім шалам агортваюць ноч цягнікі.
І маркотная фройлян у далёкім Франкфурце
Палівае алеем для пятліц гвазьдзікі.

А дакладней, гвазьдзікі.
Фэтровы капэлюш
На білет у вар”ятню мяняе сусед.
І з сабору Нотр-Дам пазьляталі хімэры.
І нарэшце купіў драматург пісталет.

11.08.93

* * *

А я хачу, каб вы нарэшце здрадзілі.
Каб вы спазналі, што такое грэх.
Каб вам, салодзенькай, якая-небудзь гадзіна
З гаркавасьцю падсунула гарэх.

Калі ж нарэшце вы яго раскусіце,
І скрывіць вусны вашыя падман, -
Ў ватрутны келіх бранзалет апусьціце,
Што ад сурокаў дараваны вам...

8.08.93

калі я з раніцы нап”юся
і буду біць вітрыны ў крамах
ты будзеш песьціцца ў пасьцелі
ды навучаць партнэра сэксу

калі ж я выращу страляцца
а вас адолеюць аргазмы

тады рука мая ня дрыгне
ў вакно я вам закіну ружу

і будуць сыпацца пялёсткі
якія можаце хоць зжэрці
ў мяне тры кулі засталося
як шандарахне тады бомба
мазгі ў столь! вось гэта сэкс!

"Пьянству – бой!" – скажу я сьмела.
Та ж – на неба паляцела!

21.11.93

Шануйма эротыку!

У рытме наскім палянэза
Я качаў цябе па сьнезе,
Цалаваў у пуп.
Ты ж у млосьці скавытала
І крычала: "Мала! Мала!"
Ды бадала дуб.

О, як гэта эратычна!
Элегантна, хвантастычна!
Непаўторна як!
З усяе магутнай сілы
Ў вуха рыкаеш ты: "Мілы!
Налівай каньяк!"

Ды даўно пустая пляшка…
Нас чакае калымажка
І гарачы кныр.
О, вар"яцкае каханьне!
У дуброве мілаваньне!
Сярод мору пір…

9.01.93

* * *

мы ляцім на дзікім эрапляне
пад крылом загубы ды згрызоты
а са мной – аголеная пані
эскадрыльля за сьпіной сэксотаў

і на нашым дзікім эрапляне
ў бэнзабаку поўна самагону
і ўпіваецца аголеная пані
і пікуе на палеткі-гоні

а ў тых гонях жахі ды згрызоты
на палетках пасткі ды загубы
і шныраюць пачкамі сэксоты
і ў іржавыя анёлы трубяць трубы.

1994

* * *

вы канешне хацелі б каб я распрануўся
ды зусім галяком на сьвінюшню узьдзёрся
і каб потым я там адчыніў рэстарацыю
і таму хто ня ў смокінгу біў проста ў скулу

хто ня ў смокінгу хай са сьвінюшні зьлятае
і лунае над Менскам ці нават Парыжам
няхай плюхнецца ў бруд рассыпаючы пырскі
“Vita brevis – ars longa” –
расьцячэцца па Сене
(ці сену?)

вось таму і дарэмныя вашы чаканьні:
я ўжо распрануўся а вы рагаталі
і ў смокінгах пёрліся ў маю рэстарацыю
і голага білі мяне проста ў скулу.

24.03.94

Моташна

Жонка пайшла... Вецер скуголіць
Скача ля буды лядашчы сабака
Шклянку “Сталічнай” яму наліваю
Толькі ня пье са мной нават сабака.

Жонкі зыходзяць а мы застаемся
Разам з сабою і разам зь сябрамі

Разам са шклянкай гарэлкі “Сталічнай”
Толькі ня пье са мной нават сабака.

Вернуцца жонкі а мы не пазнаем
Будзем у твар зь ветрам шалым сьмяяцца
Будзем глядзецца ў шклянку “Сталічнай”
Толькі ня пье са мной нават сабака!

Зноў яны пойдуць. Ранак прыціхлы
І на патэльні зьмерзла яешня.
Пырсьне асколкамі шклянка “Сталічнай” –
Выпі са мною, аблезлы сабака!

Толькі ня пье…
Жонка пайшла…
Мухі на шкле…
Моташна, брацe.

1993

* * *
А ваш цягнік праходзіць міма.
А я, разява, на пэроне.
І пралятаюць міма зімы,
Якіх нічым ўжо не дагоніш.

А вы махаеце здалёк мне,
А я вас бачу і ня бачу.
Ад сьнегу мае шчокі змоклі.

А хтосьці кажа: “Дурань, плача!..”

І я шапчу: “Канешне, дурань”.
І вус смакчу, нібы цыгарку.
І толькі аб адным шкадую,
Што мне ніхто ня дасьць па карку!

За тое, што цягнік ваш – міма!
За тое, што я сам – разява!
І што са смьехам аддаў зімам
Мне прыналежнае па праву.

23.02.93

* * *

Чакаеце… Вы зноў мяне чакаеце.
А мне да вас… І спраў няма да вас.
Дарэмна мне, бы незнарок, міргаеце –
Той час мінуўся! Спарахнеў той час.

Ды вам няўцям. Вы нават крыху плачаце.
Дарма, харошая!.. Той шаласьці – няма.
Сэнтымэнтальны, ва ўнісон заплачу я.
Ды ўсё дарма.
Дарма, дарма, дарма…

І ўсё ж – чакаеце.
Ну што, ну што ж, чакайце!
І сапраўды – шляхоў няма назад.

Але пад вечар брамку адчыняйце,
Выходзьце ў белым ў чорны-чорны сад…

11.08.93

* * *

В.Б.

…А вы заўжды, вы чуеце, заўжды
Казалі… Не, нічога не казалі.
Навошта ўспамінаць? Такой бяды.
Такой бяды, што хрызантэмы зьвялі.

Няхай, няхай. Здаецца, быў гатэль.
А мо і сапраўды – адно здаецца:
Было віно… Ды не прыходзіў хмель,
І не было куды, куды ўжо дзецца.

А потым… Потым – ноч. Аўтавакзал.
(Ці так было? Ці толькі гэтым мрою?)
Я вам сказаў… Нічога не сказаў.
Пусты вакзал. І вочы ў вочы – двое.

1993

* * *
Чорнай расьціснутай сажаю –
раніца на падушцы.
Абваліўся комін на дзедавай хаце.

30.10.91-6.08.92

Споведзь самагубцы
Аргазм-паэма (1)

KAMUNIKAT.org

1.
вы прыходзілі роўна апоўначы
у пакоі рабілася сонечна
на сэрцы рабілася мулка
зыходзілі кплівым золкам
а толку?!
“Толк” – расейскае слова?
КАРОВА – інтэрнацыянальнае слова!
А як вы глядзіце на СЭКС?
(Гл. вышэй тэкст!)

2.
балюча…
ануча!
лужына
занадта разрэз завужаны

3.
Ну прычым тут жанчына, прычым?
эх, братка! Давай памаўчым…

4.
у сьвежых газэтах –
аркушы – белыя
друкуюць пра гэта
сьмелыя!

5.
Гідка, калі ўсё можна.
Лепей давай асьярожна.

Лепей давай сёньня так,
як…
як?

6.
Зараза!
Няма адказу.

7.
«Милый,
я вас любила…»
Мала!
сука
хачу каб кахала!

8.
сьвятое…
а калі не адзін, а двое?
сьвятое…
а калі сярод пляцу, з другою?
сьвятое…
а калі гандляваць сьлязою?
сьвятое…
а калі па жывым – бэнзапілою?
сьвятое…
а калі пераблытаны ролі?
сьвятое…
а калі…
не крычы,
не сьмярдзі сярод поля.

9.
жыў на сьвеце добры сабачка колі
вельмі любіў ён паштэты і волю
але болей любіў маладзенькіх сучак.
Дазвольце, спадарыня, ручку!

10.
рыпяць рыпяць вірлавокай мыліцы.
Чорт, вяроўка ня мыліцца!

11.
Была сыбота.
Спаткаліся ўпотай.
Вы лучылі пяшчоту.
а ён сядзеў у суседнім пакоі
піў каньяк
і ахайна
на скрылёчкі намазваў шпроты
Такая работа!
была сыбота...

12.
хто – ты?

13.
пытаньне –
большай няма бязглузьдзіцы
з вачадолаў бялкі вылузваюцца
а хтосьці смокча кактэйлі

апсавелі!
дакладней асабачыліся
Мілая, на тым сьвеце пабачымся.

14.
а што калі няма таго сьвету?
восень
зіма
вясна
лета...

не,

лета
зіма
вясна
восень
як толькі ногі вас яшчэ носяць!
вас апошняй кляцьбою склялі
ад зямлі
14 573 кілямэтры
да раю

15.
туды даўно
нікога
не запрашаюць.

16.
слодыч

калі сьвятых няма побач
асалода
мордай называць морду
аргазм
упадаць у рэдкакаштоўны маразм
і выкшталцонасьцю наталяцца:
сярод трупярні –
кахацца!

17.
прабачце я вас не абражаю?
а ў вас ёсьць акром жонкі краля?
паверым на слова – няма
вырак адзіны: дарма!

18.
мой мозг – мой забойца.
бывае
ён вас
ня ў час
забівае.

19.
каму балела
усе здохлі.
позна размазваць соплі
яны ня вернуцца
нішто
ня зьменіцца

20.
і быццам мы ні пры чым?
давай браток памаўчым…

21.
Калі будзеце ўспамінаць,
апускайцеканчаткі на “…маць”.

4-5 чэрвеня, 1993 г.

Споведзь зьняверцы
Аргазм-паэма (2)

1.
Я прыйшоў да Цябе, Божа.
(Ну й рожа!)
Я прыйшоў да Цябе пакаяцца.
Вермішэляй хрумсьцяць пальцы.

2.
Толькі ў чым мне каяцца, Божа?!
Я – твой вынішчаны атожылак.

3.
Душа нудзіцца,
нудзіцца,
нудзіцца.
Аб сьвятыні – таксама паскудзяцца.

4.
Апаскуджаны ці ачышчаны?
Спавядальня – уся задрышчаная.
Тут столькі зьняверцаў бывала!
Няўжо Табе вернікаў мала?

5.
- Блюзьнер! – вырашчацца хрысьціяне.
Ды знакам дараваны быў Каін.
Не да іх прыкульгаў – да Цябе.

6.
Які сэнс у Тваёй быў сяўбе?

7.
Калі зерне адьдзяліць ад паловы,
То што з паловай рабіць?
Пасыпаць зачоўпленыя галовы?

8.
А, так!
Пакаяцца трэба!

9.
Божа, даруй, што пляваў я ў запляванае неба.
Даруй, што парушаныя запаветы рушыў.
Што хлусіць Табе нават калі Ты ня чуеш
мушу.

10.
калі немагчыма перарабіць
выхад адзіны забіць
забіць выхад адзіны
перарабіць калі немагчыма

KAMUNIKAT.org

11.
А хочаш, я Табе раскажу пра Айчыну?..

12.
Беларусь, твае дзеці – дэбілы.
Ах, як міла!
І народзяць дэбілы – дэбілаў.
Ты, як маці, усіх палюбіла.

13.
Гэта я – не Табе, не Табе.
Толькі ў вершах Хрыстос – у журбе.
А ў жыцьці – Магдалену трахае:
Сем д”яблаў зь яе вышурахвае.

14.
Так, мне цяжка з Табою.
А хочаш, прыўлашчаным сабачкам завыю?
Буду рукі Табе цалаваць?

15.
блядзь!

16.
вось цяпер скавытаньне ўзьнімецца
супакойцеся: Бог ваш – ня грымнецца
у мяне на вас – не падымецца

17.
Штосьці споведзь мая ня клеіцца.

kamunikat.org

А можа, ніякі я не зьняверца?
Можа, фанатык жахлівы?
Фанатык – калі веру ў дзіва.

18.
у дзіва – у існасьць ня злую
цёплую залатую кудлаценькую
да сьмешнасьці малюпаценькую
даверлівую шурпатую
сапраўды фанатык я!

19.
банальна братка банальна
цікавей
браць жанчыну
на варштаце сталярным

20.
Хацеў яшчэ запытацца… Ды ўсё дарма.
Ні ў Бога, ні ў Д”ябла на нашы пытаньні
адказаў няма.
А калі ёсьць – дык на ўсе адразу.
Лепей ужо атруціцца газам.

21.
немагчыма трываньне…
аргазм!

23-24 чэрвеня, 15 ліпеня, 1993 г., м.Кобрынь

Споведзь цнатліўца
Аргазм-паэма (3)

1.
Мілая, мілая жанчына.
Вазьмі ты мяне, нявіннага.
Прыўлашчы мяне, дурнаватага!

2.
уздоўж дарогі – грэшныя вершы расьпятыя

3.
пяшчотна й груба
лопаюць губы
і як на ліха
ціха ціха ціха...
ціха ціха ціха ціха

4.
хораша як!
“Ты, наверно, дурак?”

5.
Пэўна, дурань, калі з вамі балакаю.
прыўлашчыць бы вас
ды ў варыва – сракаю!
а тады крываўце мне морду
я – дурань высакародны

6.
у нас эліта
ўся пабіта
ці ўсё ж пабітая?

7.
а можа, жыдзяра я?

8.
У, гад!
Крочым разам на парад.
У калёну па чатыры.
На нагох у нас па гіры.
У рукох у нас сьцяжкі
Палымнеюць на вякі.
Усе мы – баль-ша-вя-кі!!!

9.
Значыць, жыдзяра.
Расстраляць за амбарам!
Паночку, паночку!
Я – дурань! Я пераседжу ў куточку...

10.
А ў тым куточку
расьпінаюць сыночка.
не, ня Богава.
і ты да іх – са сваёю падмогаю
як ён ручкамі торгае!

11.
гэта твой сынок?!
я ж – цнатлівец!
які зь мяне толк.

12.
забітае дзіця –
працягнутая нашчадкамі
для прашчураў
пятля
зашморгваю яе

13.
Я.

14.
я гэта й без паэты ведаю
сяньня
з удавою абедаю!

15.
ух сьлічная зараза
ускараскаюся адразу
а яна –
па бурбалках: плясь!
і гразь як князь
і князь як гразь

16.
лхта лухта лухта

тра-та-та-та!
тра-та-та-та!

17.
Наша песьня “шчэ ўся ня сьпетая.
што ж ты мілая ўжо разьдзетая
ну няхай няхай
распранутая

18.
Я цябе лахманамі ахутваю.
а можа пяшчотаю
вазьмі!.. некрануты цнатлівец я.

19.
блюзьнерыш!
і сам ня верыш.

20.
чым з гэткаю вераю
лепш па пальцах –
сякераю!

21.
вось гэта будзе аргазм!
маразм?
раб есьмь азм
не!!!
мярзотны раб есьмь азм!
ды толькі што ўзяць з дурнаватага?

22.
дык урэжце па карку лапатаю!

23.
ён гэта любіць
ён такіх далакопаў галубіць
кудзерыкі ім расчэшвае

24.
у
сваё
пітво
атруты дамешвае

25.
здох бы даўно
ды некаму ж трэба
такое гаўно!

26.
адчыніце
ў Сьвятое
вакно

3.08.93-3.01.94

## Споведзь ганарліўца
### Аргазм-паэма (4)

KAMUNIKAT.org

1.
словы словы
словы?
дровы!!
выйду на ловы
сыпіць Казанова
а
вы?

2.
а вы...:
кавы garson кавы!
разьліў разява –
прагне
славы

3.
прыйдзе мілая
адкусіць пальчыкі
а недзе месячык
на жылах сіліцца
паселі вакол філязофы
ды дзівяцца

4.
смачная каша
груца

5.

тупіца!

6.
не
лепей
тупак
ці ня так?

7.
тупак суне
фалас у вульлі
сядзіць на тым фаласе грак
і дзюбаю
робіць наколку

8.
волка...

9.
дык вось вы куды павярнулі!
а
дулю!

10.
ня жульце
перад труною

11.
толькі двое нас
толькі двое

ты
й
я
Панна мая…

12.
а халодная
бы артыстка народная
блядзь
карагодная

13.
……………………………!

14.
але ж няма
у мове нашай
матаў

15.
турма
вошы
салдаты
і салдатаў таксама няма!
А
ёсьць?..
жаўнэры

16.
забяры іх халера!

вера,

17.
вера?
і яе…
цалейшымі будуць нэрвы
сьцервы мае вы
сьцервы

18.
ну вось
моўлю прыгожа
даўно не плявалі
ў рожу?
то-та жа!

19.
а можа?..

20.
па тронкі
ўсаджаны ножык!
такі адказ

21.
запрашае да супрацоўніцтва
прэстыжны
бізнэс-дансынг-порна-кляс!
атас братка атас…

KAMUNIKAT.org

22.
што ж ты
паперу пэцкаеш?
зарабляю на чакаляды турэцкія –
ствараю нацыянальную літаратуру
ранейшае –
макулятура

23.
галаву дурыш!

24.
а хочаш
у вока?
і ляціць мая думка высока
і вобзем гаротная бракае

25.
тут просіцца
маё ўлюбёнае слова –
сракаю!

26.
і прыходзіць мае запаветная Панна
запрашае
кахацца
з тэлеэкрана
і лашчыць мяне і галубіць
і цалуе цалуе
ў губы

27.
ах халодная мая
ах галодная
быў да сёньня
бязродны й высакародны я
а цяпер
подлы маю намэр…

28.
вер мне вер

29.
у кішэнях шуруе вецер
мазгі прадзімае вецер
падлюка-вецер
сука-вецер
вецер вецер вецер
вецер вецер вецер

30.
апранаюць белае
дзеці

27-31 сьнежня, 1993 г.